*Андрэй Блінец*

# Савецкі Нясвіж у 1919 годзе
## (па матэрыялах газеты «Звезда»)

*Артыкул прысвечаны разгляду сітуацыі, якая склалася на тэрыторыі сучаснага Нясвіжскага раёна ў студзені – ліпені 1919 г. У гэтыя месяцы ішло будаўніцтва Беларускай савецкай рэспублікі, якое суправаджалася пераўтварэннямі ва ўсіх сферах жыцця і ўзброенай барацьбой супраць польскай інтэрвенцыі. Галоўнай крыніцай артыкула сталі матэрыялы газеты «Звезда», дзе часта змяшчаліся карэспандэнцыі з месцаў, рэгіянальная хроніка, франтавыя паведамленні. Аналіз гэтых матэрыялаў дазваляе разгледзець сацыяльна-эканамічнае становішча рэгіёна (гаспадарчы крызіс, рух бежанцаў, спробы тэрытарыяльна-адміністрацыйных пераўтварэнняў, новыя з'явы ў грамадскім жыцці), ход баявых дзеянняў на «нясвіжскім» участку савецка-польскага фронта. Паводле ўспамінаў удзельнікаў і тагачасных навінавых паведамленняў рэканструіраваны ход падзей Нясвіжскага паўстання – антысавецкага выступлення польскай моладзі 16 сакавіка 1919 г.*

***Ключавыя словы:*** *ССРБ, савецка-польская вайна, Нясвіжскае паўстанне, мітынг, рэквізіцыя.*

1 студзеня 1919 г. у Смаленску была абвешчана ССРБ – Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь. У яе склад увайшлі Мінская, Смаленская, Віцебская, Магілёўская і Гродзенская губерніі з сумежнымі тэрыторыямі, на якіх пераважна пражывалі беларусы [4, с. 4]. 5 студзеня 1919 г. урад ССРБ пераехаў у Мінск. 2–3 лютага тут адбыўся I Усебеларускі з'езд саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, які прыняў Канстытуцыю рэспублікі і зварот да ўсіх народаў з заклікам прызнаць самастойнасць Беларусі. Гэты ж самы з'езд пад ціскам кіраўніцтва савецкай Расіі пагадзіўся на перадачу трох губерній: Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай у склад РСФСР і даў згоду на аб'яднанне савецкай Літвы і Беларусі ў адзіную Літоўска-Беларускую рэспубліку (ЛітБел). Галоўнай

прычынай такога рашэння называлі неабходнасць сумеснай барацьбы з польскім імперыялізмам. Канчаткова аб'яднанне адбылося 27 лютага 1919 г. [40, с. 105–106]. А ў жніўні ўся тэрыторыя ЛітБел была занята польскімі войскамі. У такіх умовах рэспубліка працягвала існаваць толькі фармальна. Нягледзячы на кароткі перыяд існавання, час першай савецкай рэспублікі з'яўляецца важным момантам для разумення гісторыі нашай дзяржаўнасці.

Чым жыў Нясвіж і яго ваколіцы ў тыя месяцы савецкага будаўніцтва? Многія дакументы не захаваліся да нашага часу, а тое што ёсць далёка не поўнасцю ўведзена ў навуковае абарачэнне. Асновай для гэтага артыкула сталі матэрыялы савецкай газеты «Звезда», якая выдавалася ў Мінску як орган Цэнтральнага камітэта КП(б)Б. З 16 студзеня да 6 жніўня 1919 г. убачылі свет 159 яе нумароў (№ 349–508). Уласна Нясвіжу было прысвечана толькі некалькі публікацый (№ 388, 462, 503). Але інфармацыя пра становішча ў горадзе і ваколіцах неаднаразова сустракаецца ў раздзелах «По Белоруссии и Литве», «Хроника», «Местная жизнь», карэспандэнцыях са Слуцкага павета, паведамленнях з месцаў (Гарадзея, Сноў). Як і любыя газетныя публікацыі, яны зачастую суб'ектыўна ацэньваюць падзеі, аднак утрымліваюць шмат фактаў. Звесткі пра баявыя дзеянні на Баранавіцкім участку фронта, які ўключаў і тэрыторыю сённяшняй Нясвіжчыны, у розныя часы друкаваліся пад загалоўкамі «Наш фронт», «Оперативная сводка», «Вести с Западного фронта». Нарэшце, «Звезда», як афіцыйны орган друкавала дэкрэты, распараджэнні, пастановы савецкай улады. На падставе ўсіх гэтых матэрыялаў і зроблена спроба скласці мазаіку тагачаснага жыцця.

Перадавыя аддзелы Чырвонай Арміі ўвайшлі ў Нясвіж у снежні 1918 г., пасля таго як яго пакінулі нямецкія акупацыйныя войскі. У горадзе і валасных цэнтрах усталёўвалася савецкая ўлада. Ствараліся рэвалюцыйныя камітэты, саветы рабочых сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў, валасныя выканкамы.

Асаблівую актыўнасць у новых органах улады адыгрывалі прадстаўнікі камуністычнай (бальшавіцкай) партыі. У самім Нясвіжы дзейнічалі яўрэйскія партыі – Бунд і Паалей-Сіён, што было цалкам заканамерна, улічваючы вялікую частку яўрэяў сярод жыхароў горада. Сёння цяжка высветліць імёны ўсіх кіраўнікоў і чальцоў тагачасных органаў улады. Умовы хутка мяняліся, склад выканкамаў і рэўкамаў неаднаразова абнаўляўся. Вядома, што першым камендантам Нясвіжа пасля адступлення немцаў быў абвешчаны Андрэй Пракапчук[1], які пазней стаў ваенным камісарам. Выканкам узначаліў Файнберг, Надзвычайную камісію па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам (руск. абр. – ЧК) – Татур, міліцыю – Бялецкі [41, с. 164; 3, с. 2].

Людзям, якія ўзяліся за будаўніцтва новай улады, часта не хапала ведаў і вопыту. Здаралася, што рэвалюцыйны энтуіязм перамагаў здаровы сэнс. Вынікам гэтага былі здзекі і расправы над невінаватымі людзьмі. Неўзабаве пасля адыходу немцаў у Нясвіж прыбыў атрад Надзвычайнай камісіі Смаленскай акругі. Яго камандзір – «таварыш Салдатаў» – павёў сябе, як удзельны князь часоў сярэднявечча. На горад была накладзена кантрыбуцыя, пачаліся масавыя арышты. Калі мясцовы рэўкам сабраўся на пасяджэнне для абмеркавання паводзін прышлых чэкістаў, Салдатаў загадаў агружыць будынак і пад пагрозай кулямётаў распусціў сход. «Дзякуючы» чэкістам усяго за некалькі тыдняў аўтарытэт новай улады значна знізіўся. Нясвіжане адкрыта гаварылі, што не могуць ісці за камуністамі, назіраючы за тым, што яны робяць [2, с. 131; 13, с. 2]. У студзені 1919 г. з дапамогай рэгулярнай арміі атрад Салдатава нарэшце ўдалося раззброіць. Камандзіра, разам з паплечнікамі, аддалі

[1] *Андрэй Пракапчук* (1896–1970) – актыўны ўдзельнік усталявання савецкай улады ў Беларусі. Пасля заканчэння баявых дзеянняў скончыў медыцынскі факультэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, працаваў у Мінску. Спецыяліст у вобласці скураных і венералагічных захворванняў. Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Стваральнік беларускай школы дэрматавенеролагаў, акадэмік Акадэміі навук БССР.

пад суд, арыштаваных выпусцілі, а кантрыбуцыя, сабраная з горада нібыта растаяла ў паветры [13, с. 2].

У першыя дні 1919 г. стала вядома аб утварэнні ССРБ. 4 студзеня ў Нясвіжы адбыўся мітынг гараджан і сялян з навакольных вёсак, прысвечаны абвяшчэнню Беларускай савецкай рэспублікі. У дакументах той пары адзначана: *«Мітынг прайшоў пры вялікім яднанні народных мас рабочых і сялян. Авацыям не было канца. Настрой рабочых радасны, прыўзняты. Удзельнікі мітынга горача віталі ўтварэнне Беларускай ССР»* [42, с. 16].

Згодна з пастановамі, прынятымі ў Смаленску, тэрыторыя савецкай Беларусі падзялялася на 7 раёнаў: Мінскі, Смаленскі, Віцебскі, Магілёўскі, Гомельскі, Гродзенскі, Баранавіцкі. Кожны раён дзяліўся на падраёны, іх было ад 6 да 10. Горад Нясвіж уваходзіў у Слуцкі падраён Мінскага адміністрацыйна-гаспадарчага раёна. Гарадзея (Замір'е) – у Навагрудскі падраён Баранавіцкага раёна. Разам з тым захоўваліся і старыя назвы адміністрацыйных адзінак: «губерні», «паветы», «воласці». У першыя дні існавання рэспублікі былі прапановы перайменаваць іх, адпаведна, у «працоўныя акругі», «павеціі» і «камуны», але яны не знайшлі падтрымкі [4, с. 4]. Падзел на раёны і падраёны таксама не надта прыжыўся. Паўсюль аддавалі перавагу ранейшым «губерніям» і «паветам».

Яшчэ да Першай сусветнай вайны гучалі прапановы аб стварэнні асобнага Нясвіжскага павета, у Савецкай Беларусі аб гэтым загаварылі зноў. Павятовы Слуцк быў аддалены ад некаторых валасных цэнтраў на 90 і больш вёрст, што пры тагачасных сродках камунікацыі выглядала непераадольнай адлегласцю. З улікам гэтага паўстала пытанне аб арганізацыі Нясвіжскага павета, у які б увайшлі 6 заходніх валасцей Случчыны і 13 валасцей Ігуменскага і Навагрудскага паветаў. Пры гэтым максімальная адлегласць Нясвіжа ад цэнтра самай дальняй воласці не перавышала б 35 вёрст [14, с. 2]. Аднак, калі ў Навагрудку і Ігумене да такой прапановы паставіліся дастаткова нейтральна,

то слуцкае кіраўніцтва ўспрыняло яе ў штыкі, баючыся, што ад павета адыйдуць самыя багатыя і ўраджайныя воласці.

Прыхільнікі стварэння новай адміністрацыйнай адзінкі прыводзілі даволі пераканаўчыя аргументы. Карэспандэнт «Звезды» А. Панасін пісаў: *«Слуцк не мае ніякай арганічанай сувязі з аддаленымі месцамі. Там ён не можа наладзіць адміністрацыйны апарат. Там амаль усё насельніцтва непісьменнае. Настаўнікі не ідуць на службу, таму што ездзіць у павятовы горад за жалаваннем і школьнымі дапаможнікамі «сабе даражэй». На павятовыя з'езды з такіх валасцей ніхто не з'яўляецца, так як па-першае, гэта каштуе шалёных грошай... па-другое таму, што запрашэнне даходзіць да месца задняй датай. Напрыклад, з'езд прызначаны на 20 дзень, а папера прыходзіць 21. Тое ж самае і з рознымі тэрміновымі распараджэннямі: іх нельга своечасова выканаць таму, што на месцы яны даходзяць з жахлівым спазненнем.*

*Летам, калі «пускаюць» балоты, некаторыя воласці бываюць адрэзанымі ад Слуцка. У Слуцка няма шчупальцаў, якімі б ён мог даставаць з перыферыі тое, што яму патрэбна... Вакханалія робіцца з лясной гаспадаркай, за якой рашуча ніхто не назірае. Гэта прыводзіць да таго, што ў Слуцку, Нясвіжы і Мінску – паліўны крызіс, у той час як у губерні сотні тысяч дзесяцін лесу. Спыняюцца тартакі, запалкавыя, фанерныя і іншыя заводы. Няма будаўнічага лесу, сялянскія хаты разваліваюцца. У адной воласці сялянам дазволена браць лес для будаўніцтва, у другой воласці такога дазволу няма; у адным павеце можна рубіць лес на дровы, у другім нельга.*

*Нават дзіця зразумее, што ўтварэнне новага павета неабходна з усіх пунктаў гледжання. Аднак Слуцк пярэчыць гэтаму з упартасцю, якая даходзіць да экстаза... Пасля адной з анкет, калі сяляне нейкай воласці занадта адмоўна выказалі сваё стаўленне да Слуцка, адтуль была прыслана карная экспедыцыя. Так гавораць у Нясвіжы. Верагодна*

*перабольшваюць, так як жарсці тут дастаткова накаліліся…»* [14, с. 2].

Для вырашэння пытання пры наркамаце ўнутраных спраў стварылі асобную камісію, але спрэчка паміж дзвюма гарадамі так і не была развязана[1].

Нягледзячы на цяжкасці, пакрысе рабіліся крокі да сацыяльных і культурных пераўтварэнняў. На пачатку лютага 1919 г. у Камітэт дзяржаўнага будаўніцтва быў пададзены праект і каштарыс па электрыфікацыі Нясвіжа, які прызналі магчымым для ажыццяўлення па тэхнічных умовах [11, с. 4]. Невядома, ці прыступілі да практычнай рэалізацыі праекта. У вёсках адкрываліся школы і народныя дамы. Часам ініцыятыва сыходзіла ад саміх сялян, як гэта было ў в. Студзёнкі Гарадзейскай воласці. Тут моладзь прыстасавала пад народны дом былы «магазін» – ссыпны склад збожжа. За некалькі месяцаў яго адрамантавалі, зрабілі сцэну, а 4 сакавіка адбылося ўрачыстае адкрыццё. Прыбранае памяшканне было ўпрыгожана яловымі галінкамі, а каля сцэны стаялі чырвоны і чорны сцягі. На чырвоным быў зроблены надпіс «Просвещение бедноте, диктатура пролетариату», на чорным – «Слава борцам, павшим за свободу» [14, с. 3]. Дом выкарыстоўваўся як бібліятэка, чытальня, месца для правядзення сходаў, вечарын і тэатральных пастановак. Для забеспячэння вёсак літаратурай у Нясвіжы было створана адмысловае ўпраўленне па распаўсюджванні друкаванай прадукцыі [16, с. 4]. У адпаведнасці з павевамі часу перавагу аддавалі палітычнай літаратуры, хаця на вёсках найбольшым попытам карысталася белетрыстыка і кнігі па гаспадарцы.

Станаўленне Беларускай савецкай рэспублікі праходзіла ва ўмовах ваеннай пагрозы з боку адноўленай польскай дзяржавы.

---

[1] *П. Казак,* які ў 1919 г. служыў пісарам ваеннага камісарыята, пазней прыгадваў, што ў ліпені быў утвораны асобны Нясвіжскі павет у складзе 10 валасцей [3, с. 2], але іншых падцвярджэнняў гэтаму не выяўлена. Не выключана, што аўтар успамінаў пераблытаў падзеі 1919 і 1920 гг.

У адрозненні ад немцаў, якія адназначна ўспрымаліся як чужынцы, з палякамі ўсё было складаней. Нашы народы доўгі час жылі ў адной дзяржаве, польская мова і культура былі распаўсюджаны сярод вярхоў грамадства, многія сяляне-каталікі лічылі сябе палякамі. Лідар Польшчы Юзаф Пілсудскі быў не супраць, каб яе ўсходнія межы прайшлі па Дзвіне і Дняпру. На гэтай тэрыторыі многія з ахвотай прызналі б сябе палякамі, для астатніх быў прыгатаваны пернік у выглядзе абяцанняў шырокай нацыянальна-культурнай беларускай аўтаноміі.

Савецкі ўрад яшчэ 7 студзеня 1919 г. папярэдзіў Варшаву, што калі яна паспрабуе *«сілай зброі навязаць незалежным рэспублікам Літвы, Латвіі ці Беларусі чужую ім уладу, то рабочыя і сяляне гэтых рэспублік будуць змагацца ў рэвалюцыйных народных войсках супраць замахаў польскага імперыялізму»* [39, с. 73]. Рыхтуючыся да будучых баёў, урад ССРБ прыняў дэкрэт аб мабілізацыі і ўсеагульным ваенным навучанні. Вайсковай справай павінны былі авалодваць усе грамадзяне савецкай Беларусі, ад школьнікаў і да мужчын прызыўнога ўзросту ад 18 да 40 гадоў. Заняткі павінны былі праходзіць не менш чым 12 гадзін на тыдзень на працягу 8 тыдняў. Адначасова з гэтым абвяшчалася мабілізацыя *«па меры неабходнасці»* мужчын ва ўзросце ад 21 да 26 гадоў. Яны павінны былі заставацца ў армейскіх шэрагах нявызначаны тэрмін *«у залежнасці ад ваеннага становішча краіны»* [5, с. 4]. Менавіта тады сотні нясвіжан апынуліся ў шэрагах Чырвонай Арміі. Праўда, часцей за ўсё іх накіроўвалі не на абарону сваіх межаў, а на барацьбу з белымі арміямі ў Сібір ці на Поўнач.

У самім Нясвіжы знаходзіўся 9-ты пагранічны полк 17-й стралковай дывізіі. Аддзел быў сфарміраваны з дабраахвотнікаў летам 1918 г. у Оршы для аховы дэмаркацыйнай савецка-нямецкай лініі. Пры гэтым перавагу стараліся аддаваць вайскоўцам, якія мелі вопыт службы на граніцы. Палком камандаваў Леанід Зацяплінскі – колішні палкоўнік царскай арміі, які шмат гадоў служыў у пагранічнай варце. Большасць камандных пасад

таксама займалі былыя афіцэры. У лістападзе 1918 г. полк перавялі ў Мінск, у студзені 1919 г. – у Нясвіж. Некаторыя роты размяшчаліся ў навакольных вёсках – Пахабаўшчыне[1], Качановічах і Вайнілавічах. Падчас знаходжання палка на Нясвіжчыне ён папаўняўся мясцовымі дабраахвотнікамі. Камандзіры арганізоўвалі мітынгі. Так, камісар 2-га батальёна Фёдар Шпакаў 2 сакавіка правёў мітынг у Нясвіжы, 3 сакавіка – у Дубейках, 5 сакавіка – у Пахабаўшчыне.

Мітынгі ў тыя дні праводзіліся часта і з розных нагод. 15 лютага ў Лані адбыўся мітынг, прысвечаны Дню ўсеагульнага ваеннага навучання [2, с. 124]. 23 лютага ў Гарадзеі шэсцем, прамовамі і канцэртам была адзначана першая гадавіна Чырвонай Арміі. Урачыстасці атрымаліся асабліва шматлюднымі з-за вялікай колькасці ваеннапалонных. Асаблівае ўражанне на прысутных зрабіла выступленне прадстаўніка палонных венграў [12, с. 3]. Справа ў тым, што на пачатку 1919 г. з Расіі вярталіся на радзіму палонныя аўстра-венгерскай і нямецкай армій, у адваротным кірунку рухаліся сотні тысяч былых вайскоўцаў Рускай імператарскай арміі. Чыгуначная станцыя Замір'е і пасёлак Гарадзея, размешчаныя на лініі Масква – Брэст сталі важным этапным пунктам як для палонных, так і для бежанцаў, прымусова эвакуіраваных з Заходняй Беларусі ў 1915 г., якія цяпер спрабавалі вярнуцца ў родныя мясціны. На Нясвіжчыне актыўна дзейнічалі ўпаўнаважаныя Калегіі па справах палонных і бежанцаў (копленбежа), якія павінны былі вырашаць пытанні, звязаныя з рухам людскіх мас, іх харчаваннем, медыцынскім абслугоўваннем. Са студзеня 1919 г. для іх патрэб ў Замір'і працаваў лазарэт Чырвонага Крыжа на 150 ложкаў [36, с. 3].

14 лютага на Брэстчыне адбыліся першыя сутыкненні паміж савецкімі і польскімі войскамі. Вайна стала фактам. 25 лютага 1919 г. загадам народнага камісара па ваенных

---

[1] *Пахабаўшчына* (суч. назва Альбянка) – вёска ў 3 км на поўдзень ад Нясвіжа.

справах А. Мяснікова ў Мінскай губерніі абвяшчалася ваеннае становішча [10, с. 4]. Гэта наклала адбітак на ўсе сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, галоўным з якіх было вырашэнне зямельнага пытання.

Першы з'езд саветаў Беларусі абвясціў усю зямлю адзіным дзяржаўным фондам і рэкамендаваў весці гаспадарку на сацыялістычных пачатках. Былыя памешчыцкія маёнткі павінны былі стаць асновай для ўтварэння саўгасаў, сялянскія надзелы прапаноўвалася аб'ядноўваць у арцелі і камуны. Але рэалізацыя гэтых прапаноў на практыцы выклікала вялікія праблемы. Вось што пісала «Звезда» пра становішча на Случчыне ў студзені 1919 г.: *«Усе маёнткі ў павеце ўзяты на ўлік. Павятовым зямельным аддзелам туды прызначаны камісары. У большасці маёнткаў хлеба няма, паколькі былыя памешчыкі да прыхода савецкіх войскаў усё пастараліся прадаць, а збожжа, якое ёсць у неабмалочаным выглядзе, узята камісарамі на ўлік, апячатана і закрыта ў свіранах, з-за чаго людзі і жывёла галадаюць. Сярод свойскай жывёлы лютуе кароста, медыцынскай дапамогі няма. Батрацкія камітэты ня маюць грошай для пакупкі лекаў. Асабістымі сродкамі батракі не валодаюць, так як памешчыкі не плацілі ім амаль год, таксама не выплачана ні капейкі за работу пры савецкай уладзе»* [6, с. 3].

У параўнанні з суседнімі рэгіёнамі харчовае забеспячэнне Нясвіжа выглядала кепска. Прадукты, якія прывозілі на рынак, у вялікай колькасці закупалі прадстаўнікі «копленбежа» [6, с. 3], так што знайсці ў вольным продажы хлеб ці мяса было цяжка. Цэны на прадукты харчавання хутка раслі. Калі ў сярэдзіне студзеня кілаграм сала каштаваў 15–20 рублёў, то ў пачатку лютага за яго плацілі 60–65 рублёў. Упаўнаважаныя камісарыята харчавання (кампрода) не маглі нарыхтоўваць хлеб для арміі і буйных гарадоў, паколькі прыватныя гандляры куплялі яго ў сялян на значна лепшых умовах – па 100–150 рублёў за пуд, у той час як цвёрдыя дзяржаўныя закупачныя цэны складалі

16,25 рублёў за жыта і 21,50 рублёў за пшаніцу [8, с. 3]. Прадстаўнікі органаў улады скардзіліся, што *«...мяшочнікі і спекулянты нібыта саранча спусташаюць гарады і вёскі...»* У выніку ўрадавым дэкрэтам было забаронена купляць і прадаваць хлеб прыватным асобам. Яго маглі нарыхтоўваць толькі па цвёрдых цэнах дзяржаўныя органы [7, с. 2]. На практыцы гэта прывяло да новага вітка спекуляцыі.

14 лютага 1919 г. быў падпісаны загад, паводле якога для армій Заходняга фронта рэквізіраваліся ўсе запасы збожжа, у тым ліку і насенны матэрыял, які захоўваўся ў нацыяналізіраваных маёнтках. Любыя спробы захаваць збожжа або насенне разглядаліся як *«супрацьдзеянне Чырвонай Арміі ва ўмовах ваеннага часу»* [9, с. 4]. Праз нейкі час у паветы пайшло распараджэнне аб абавязковай пастаўцы свойскай жывёлы і мяса па цвёрдых цэнах, вываз мясных прадуктаў за межы Мінскай губерніі забараняўся. За выкананнем паставак сачылі валасныя харчовыя аддзелы [10, с. 4]. 15 сакавіка быў абвешчаны Тыдзень хлеба, на працягу якога гарадское і вясковае насельніцтва было абавязана здаваць хлеб, фураж і іншыя прадукты харчавання на патрэбы войска. Ад людзей патрабавалася *«напружыць усе сілы, каб на справе давесці клопат і любоў да Чырвонай Арміі»* [15, с. 3]. Падводзячы вынікі тыдня, губернскі ваенны камісар Крывашэін адзначаў, што ў паласе ад Нясвіжа да Баранавічаў многія воласці дабраахвотна перадавалі хлеб для арміі як па цвёрдых цэнах, так і бясплатна. Праўда, незадоўга перад тым назіральнікі адзначалі, што насельніцтва рэгіёна аддае перавагу *«свабоднай спекуляцыі»*, а не добраахвотнай перадачы лішкаў, і разлічваць на яго падтрымку па ідэйных матывах не даводзіцца [13, с. 2]. Не станем гадаць, якое з гэтых сцвярджэнняў больш адпавядала рэчаіснасці.

На мяжы лютага-сакавіка 1919 г. паліцы нясвіжскіх крамаў канчаткова апусцелі. Сродкаў у гарадскім бюджэце не хапала. Для вырашэння надзённых праблем быў створаны «Надзвычайны штаб па ахове рэвалюцыйнага парадку». 3 сакавіка на слупах

з'явіліся аб'явы, якія абвяшчалі горад на асадным становішчы. Выхад на вуліцу з 19.00 4 сакавіка да 10.00 раніцы наступнага дня быў забаронены. Пакуль нясвіжане сядзелі па дамах, на тэрміновую нараду склікалі прадстаўнікоў сацыялістычных партый і прафсаюзаў. Ім абвясцілі, што горад падзелены на 42 участкі для правядзення вобшукаў. На кожны ўчастак накіроўваўся атрад з шасці чалавек: трох чырвонаармейцаў, аднаго прадстаўніка партыі камуністаў і двух прадстаўнікоў яўрэйскіх партый Бунд і Паалей-Сіён. З 10 гадзін вечара ў дамах заможных мяшчан («спекулянтаў і гарадской буржуазіі») пачаліся вобшукі. «Звезда» паведамляла, што ў выніку гэтага было вылучана шмат прадуктаў, залатыя манеты, спірт, мануфактура і іншыя тавары. Асаблівы націск чамусці рабіўся на тым, што ў кватэры каталіцкага ксяндза знайшлі 33 бутэлькі віна і каньяку [16, с. 4].

Тым часам сітуацыя на фронце ўсё больш накалялася. 13 сакавіка выйшаў загад аб аб'яднанні ўсіх чырвонаармейскіх вайсковых адзінак і злучэнняў, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі і Літвы, у Беларуска-Літоўскую армію. У той самы дзень 9-ы пагранічны полк з Нясвіжа быў накіраваны ў раён Ганцавічы – Лунінец для абароны Пінскага напрамку. У горадзе застаўся толькі невялікі аддзел мясцовых чырвонаармейцаў, якім камандаваў А. Пракапчук. У прыфрантавой паласе, пад Навагрудкам, Баранавічамі, Нясвіжам дзейнічалі польскія атрады, якія здзяйснялі дыверсіі на дарогах, нападалі на вёскі і мястэчкі, праводзілі аперацыі ў тылах Чырвонай Арміі. Яны знаходзілі падтрымку часткі мясцовага насельніцтва.

У Нясвіжы, дзе яшчэ з даваенных часоў існавалі польскія культурна-асветніцкія арганізацыі, было нямала прыхільнікаў аднаўлення незалежнай Польшчы. Адным з асяродкаў такіх настрояў стала гімназія, у работу якой савецкая ўлада асабліва не ўмешвалася. Абмежаваліся тым, што забаранілі штодзённыя малітвы і загадалі зняць абразы, якія віселі ў аўдыторыях [45]. Між тым вучні старэйшых класаў аб'ядналіся ў падпольную

арганізацыю, якую ўзначаліў выкладчык лацінскай мовы Мечыслаў Валністы. Першачарговай задачай стаў збор зброі. З ваколічных вёсак і бацькоўскіх дамоў гімназісты таемна звозілі паляўнічыя стрэльбы, вінтоўкі, пісталеты, патроны. Неўзабаве яны мелі каля 30 вінтовак і некалькі рэвальвераў [45].

Інфармацыя пра падрыхтоўку паўстання даходзіла да выканкама. На пачатаку сакавіка ЧК прапанавала правесці арышты сярод патэнцыяльных ворагаў: *«панскіх паслугачоў і варожа настроеных інтэлігентаў»*. Аднак старшыня выканкама Файнберг палічыў, што для разгортвання рэпрэсій няма падстаў [41, с. 164].

У ноч з 14 на 15 сакавіка аддзел легіянераў маёра Дамброўскага нечаканым налётам захапіў мястэчка Сіняўка ў 35 км ад Нясвіжа. Адтуль у розныя бакі накіраваліся конныя раз'езды выведнікаў. Весткі пра іх з'яўленне маланкай разнесліся па павеце, абрастаючы ўсё новымі падрабязнасцямі. Нехта бачыў іх каля Снова, нехта сустрэў раз'езд і на запытанне *«Калі вас чакаць у Нясвіжы?»* атрымаў адказ: *«Хутка!»* [45]. Атрад Пракапчука – адзіная рэльная сіла савецкай улады ў Нясвіжы, накіраваўся ў бок Сіняўкі. У горадзе застаўся толькі аддзел міліцыі. У такіх умовах група польскай моладзі наважылася на ўзброенае выступленне.

Ноччу з 15 на 16 сакавіка пачалося паўстанне. Частку міліцыянераў захапілі соннымі на кватэрах і раззброілі. Пры гэтым абыйшлося без ахвяр. Але ў перастрэлцы ў цэнтры горада былі забіты старшыня выканкама Файнберг, чэкісты Розэнблюм і Татур, сябра рэўкама Грынблат. Паўстанцы захапілі галоўныя адміністрацыйныя будынкі, вызвалілі з турмы арыштантаў. Над ратушай узняўся польскі сцяг. Была арганізавана камендатура, на вуліцах расстаўлены патрулі. На гэтым паўстанцы палічылі сваю місію скончанай і пачалі рыхтавацца да сустрэчы з кавалерыстамі Дамброўскага [44, s. 143; 45]. Ніхто не ведаў, што тыя ад Сіняўкі павярнулі назад і зусім не збіраліся ісці на Нясвіж.

Тым часам бальшавікі дзейнічалі рашуча. Андрэй Пракапчук успамінаў: *«Мой атрад толькі што вярнуўся ў горад. Але ініцыятыва была ў руках паўстанцаў, і нам давялося адступіць. Пагрузілі на двухколку тэлеграфны апарат і рушылі на вёску Рудаўка. Уздоўж дарогі стаялі тэлеграфныя слупы. Я загадаў тэлеграфісту залезці на слуп і падключыцца да лініі. Такім чынам звязаліся з Мінскам. У Мінску да апарата падышоў губернскі ваенны камісар Крывашэін. Я далажыў абстаноўку, і ён загадаў мне нікуды больш не рухацца, трымацца да апошняга патрона. Сказаў, што высылае нам на дапамогу роту штыкоў і бронецягнік»* [41, с. 164].

Ад бронецягніка, які прыйшоў у Замір'е, карысці было мала. А вось рота байцоў з двумя кулямётамі каля пяці гадзін вечара 16 сакавіка прыбыла ў Рудаўку. Не губляючы часу, чырвонармейцы пайшлі ў наступленне і пасля непрацяглай перастрэлкі ўвайшлі ў горад. Мінскі ваенны камісар Крывашэін праз некалькі дзён гаварыў: *«Замест рэгулярных сіл у Нясвіжы мы сутыкнуліся з жалюгоднымі легіянерамі і бойскаўтамі. Хапіла 80 добра ўзброеных камуністаў, каб выгнаць бандытаў з Нясвіжа. Пры падыходзе чырвонаармейцаў белыя, мамкіны сынкі, пужлівыя бойскаўты ўцякалі, як труслівыя зайцы»* [16, с. 3].

Раніцай, у панядзелак 17 сакавіка, выступленне было канчаткова задушана. Колькасць яго ахвяр падлічыць складана. У ацэнках, якія былі дадзены па гарачых слядах эмоцыі пераважаюць над фактамі. «Звезда» пісала: *«...нашы чырвонаармейскія аддзелы ўвайшлі ў горад і арыштавалі вінаватых, якіх тут жа на месцы расстралялі. Усяго расстраляна звыш 100 чалавек. Іх маёмасць канфіскавана»* [19, с. 3]. Праз нейкі час у аглядзе замежнай прэсы было перадрукавана паведамленне варшаўскай газеты "Kurier Poranny": *«Бальшавіцкія войскі пачалі ажыццяўляць жахлівыя эксцэсы. Усіх секлі і ўсё палілі. Расстраляна звыш 50 чалавек, у тым ліку ксяндзы Станіслаў Рокаш, Вінцэнт Гадлеўскі і дырэктар гімназіі Мар'ян Масоніус. Вёскі Слаўкава і Качановічы*

*спалены за тое, што далі прытулак уцекачам, кожны дзясяты іх жыхар расстраляны, жанчыны згвалтаваны, і канфіскавана ўсё, што можна. Каталіцкае насельніцтва Нясвіжа асуджана на галодную смерць»* [24, с. 2]. Аб тым наколькі гэта адпавядае сапраўднасці можна меркаваць хаця б па тым факце, што названыя тут святары не загінулі падчас апісаных падзей. Прынамсі ксёндз Гадлеўскі дажыў да 1942 г., калі стаў ахвярай нямецкіх акупантаў. А ксёндз Рокаш і ў 1920-я гг. служыў у Нясвіжскім касцёле. У абодвух выпадках перад намі тыповыя ўзоры прапаганды, закліканыя стварыць адпаведна вобраз «труслівага контррэвалюцыянера» і «крывавага бальшавіка».

Да 20 сакавіка сітуацыя на Случчыне адносна нармалізавалася. Сіняўка зноў была занята чырвонымі аддзеламі. Ваенкам Крывашэін запэўніваў, што *«становішча фронта ўстойлівае і прыняты рашучыя меры для знішчэння польскіх контррэвалюцыйных банд»* [17, с. 3]. А 21 сакавіка 1919 г. ён жа падпісаў Загад № 100, які абвяшчаў «страшны крывавы тэрор» у адказ на акцыі «польскай буржуазіі»: *«...за кожнага безабароннага рабочага або селяніна, расстралянага польскімі белагвардзейцамі або контррэвалюцыянерамі, будуць знішчаны цэлыя сем'і буржуазіі і памешчыкаў»* [18, с. 4].

24 сакавіка ў Нясвіжы расстралялі пецярых актыўных удзельнікаў антысавецкага паўстання Мечыслава Валністага, Палікарпа Каляду, Станіслава Іваноўскага – бухгалтара радзівілаўскай адміністрацыі, Юзафа Янушкевіча – службоўца княжацкага палаца і Канстанціна Шыдлоўскага. Большасць арыштаваных праз нейкі час была выпушчана з турмы. У маі аднавілася дзейнасць гімназіі [44, s. 141, 144]. Нягледзячы ні на што, жыццё ў горадзе не перапынілася. А само паўстанне на фоне барацьбы за штодзённае выжыванне хутка забылася…

Яшчэ да Першай сусветнай вайны Слуцкі павет разам з Навагрудскім, у склад якіх уваходзіла тэрыторыя сённяшняй

Нясвіжчыны лічыліся найбольш ураджайнымі раёнамі ва ўсёй Беларусі. Нават пасля нямецкай акупацыі 1918 г. яны захавалі за сабой статус «жытніцы Мінскай губерні». Але ўсяго за некалькі месяцаў 1919 г. становішча змянілася. Некалі багаты і ўрадлівы край апынуўся перад пагрозай голаду. Плошча пасеваў у прыфрантавой паласе няўхільна змяншалася і ўрэшце рэшт складала толькі трацiну ад даваеннага ўзроўню. Значную частку тэрыторыі займалі ваенныя аб'екты – акопы, бліндажы, хады зносін, склады. Да ранейшых абарончых рубяжоў дадаваліся новыя. Перасоўванні і расквартараванні войска, мабілізацыі, рэквізіцыі прывялі да змяншэння запасаў збожжа. Каб захаваць прадукты, нават мясцовыя органы ўлады былі вымушаны ўтойваць іх наяўнасць. Так, Гарадзейскі валвыканкам паведамляў, што не мае прадуктаў для забеспячэння арміі, пры тым што ў мястэчку на складах знаходзілася 2000 пудоў аўса, 20 000 пудоў бульбы і інш. [2, с. 133].

Пасяўная 1919 г. скончылася правалам. Сярод прычын гэтага называлі адсутнасць насення, вострую харчовую патрэбу і нестабільнае становішча [20, с. 3]. Людзі не мелі ўпэўненасці ў бліжэйшай будучыні, а таму не бачылі сэнсу вырошчваць хлеб, які ў выніку ўсё роўна маглі страціць. Памешчыцкія маёнткі, якія павінны былі стаць асновай для ўзорных савецкіх гаспадарак, у найбольшай ступені аказаліся закрануты крызісам. Так, у Альбянскім ключы князя Радзівіла, у які ўваходзілі фальваркі Альба, Ферберкава, Малева і Заазер'е, засталіся неапрацаванымі 200 га ворнай зямлі. Колькасць працоўных і верхавых коней у гаспадарцы у параўнанні з летам 1918 г. зменшылася на палову і склала 36 галоў [43, s. 33].

Са Сноўскай воласці пра ход пасяўной паведамлялі: *«Надзвычайнымі цяжкасцямі з'яўляюцца: недахоп насення, прылад працы і інвентара. Гэта галоўным чынам адбіваецца на апрацоўцы зямель былых маёнткаў. У большасці з іх усё было вывезена немцамі і былымі гаспадарамі. Таму землі маёнткаў*

*даводзіцца аддаваць тым, у каго ёсць насенне і неабходны інвентар. Бяруць іх батракі, бежанцы, але абрабляць вялікую плошчу яны не могуць, таму засейваюць зямлю толькі ў такіх памерах, каб неяк задаволіць патрэбы сваёй сям'і. Пра камуны ці іншыя аб'яднанні не чуваць»* [25, с. 3].

Гаспадарчае становішча Нясвіжчыны ўскладнялася наплывам бежанцаў. Людзі, якія ў 1915 г. былі прымусова эвакуіраваны з родных мясцін, цяпер стараліся вярнуцца на радзіму. Іх не палохала нават перспектыва пераходу лініі фронта. А паколькі зрабіць гэта было няпроста, цэлыя сем'і чакалі зручнага моманту. Не маючы жылля, яны начавалі ў зямлянках, буданах, часам займалі старыя бліндажы ці акопы [20, с. 3]. Але нават пераход фронту яшчэ нічога не гарантаваў. Так, у чэрвені 1919 г. вялікая група бежанцаў-яўрэяў перайшла на занятую палякамі тэрыторыю ў раёне Хвоева. Адтуль яны спадзяваліся вярнуцца ў свае мястэчкі. Аднак легіянеры іх збілі, абрабавалі і адправілі назад. Людзі былі вымушаны ўладкоўваць жыццё пад адкрытым небам без ніякіх сродкаў да існавання. На станцыі Пагарэльцы знаходзілася 12 000 бежанцаў, якіх палякі адмаўляліся прапускаць [29, с. 2].

У маі 1919 г. «Звезда» пісала аб бежанцах у Сноўскай воласці: *«Харчовая патрэба стаіць вельмі востра. Прадуктаў мала, хлеб у большасці заканчваецца. Асабліва востра недахоп прадуктаў заўважаецца сярод бежанцаў, якія аселі тут і яшчэ прыбываюць. У іх асяродку недаяданне – звычайная справа, апошнім часам яно замяняецца сапраўдным голадам. З-за кепскага харчавання і агульных антысанітарных умоў – бруду, скучанасці і г. д. узнікаюць розныя захворванні. Смяротнасць надзвычай высокая»* [25, с. 3]. Выпадкі сыпнога тыфу і воспы сталі звыклай з'явай для вясны 1919 г. Спецыялісты асцерагаліся эпідэміі халеры і іншых інфекцый. Для забеспячэння бежанцаў у распараджэнне Чырвонага Крыжа быў перададзены харчавальны пункт у Замір'і. У першыя дні чэрвеня па заданні Савета Абароны ЛітБел ССР

пачалося фарміраванне санітарных лятучак, якія павінны былі прадухіліць эпідэміі ў прыфрантавой паласе [36, с. 3].

Як заўсёды, у «смутныя часы» ажывіліся аматары лёгкай здабычы. Калі ў тылавых раёнах Случчыны назіраўся адносны спакой, то ў прыфрантавой паласе панаваў сапраўдны хаос. Цэлыя групы бежанцаў аб'ядноўваліся ў банды, якія займаліся крадзяжамі і рабункамі, часам да іх далучаліся дэзерціры. Карыстаючыся непісьменнасцю сялян, яны іншы раз выдавалі сябе за атрады рэгулярнай арміі, якія праводзяць рэквізіцыі «ў імя рэвалюцыі» [28, с. 3]. Сведкі адзначалі, што часам і чырвонаармейцы паводзілі сябе не лепш за бандытаў. Былі выпадкі самавольных пабораў, калі ў сялян адбіралі прадукты, коней, свойскую жывёлу. Часта байцы гналі «рэквізіраваных» коней у суседнюю вёску і там прадавалі. Распаўсюджанай з'явай стаў няроўны абмен: салдат прыязджаў на заморыным і ледзьве жывым кані, браў сабе свежага, пакідаючы гаспадару знясіленую клячу, і знікаў. Тых, хто спрабаваў пратэставаць, патрабуючы дакументы на права рэквізіцыі або распіскі ў атрыманні забранага, збівалі, пагражалі расстрэлам. Нават адданыя савецкай уладзе людзі прызнавалі, што *«...на гэтай глебе сярод насельніцтва* [Сноўскай воласці – *А. Б.*]*, якое раней добразычліва ставілася да абаронцы працоўных – Чырвонай Арміі, назіраецца незадавальненне і абурэнне. Сімпатыі змяняюцца варожым пачуццём і крыўдамі, якія распаўсюджваюцца на ўсё савецкае. Адначасова з гэтым заўважаецца "работа" цёмных элементаў. Асобныя выпадкі абагульняюцца, узводзяцца ў ступень характэрных асаблівасцяў існуючага ладу, выклікаюць недавер да яго і чаканне "вызваліцеляў", якое амаль не хаваюць»* [25, с. 3].

Польскіх «вызваліцеляў» адны чакалі з надзеяй, другія – са страхам. Падзеі сакавіка 1919 г. паказалі, што мясцовая ўлада не заўсёды дэманструе належную вытрымку, а часам і сама правакуе паніку. Так, у Слуцку пасля весткі пра захоп Сіняўкі

пачалася спешная эвакуацыя савецкіх установ. Для барацьбы з такімі настроямі 8 мая 1919 г. Савет абароны Літоўска-Беларускай рэспублікі выдаў загад, які забараняў эвакуацыю мясцовых органаў улады з прыфрантавой паласы. У выпадку небяспекі разам з цывільным насельніцтвам мог выехаць толькі скарбнік для перадачы фінансавых справаздач і асобы, непрыдатныя да воінскай службы. Усе астатнія абавязаны былі ўступаць у шэрагі Чырвонай Арміі і заставацца там да *«паўторнага заняцця месцаў іх службы»* [21, с. 4].

Вясной 1919 г. была абвешчана мабілізацыя членаў сацыялістычных партый. Да пачатку мая ў Нясвіжы сфарміравалі яўрэйскі атрад, у які ўвайшлі сябры Паалей-Сіёна. Яго пакінулі для абароны горада. А вось другі атрад, які складаўся з бундаўцаў, накіравалі ў Мінск разам з аддзеламі са Слуцка, Бабруйска, Койданава, Любані, Магілёва, Гомеля [21, с. 4; 23, с. 3].

Напрыканцы вясны назвы населеных пунктаў Нясвіжчыны пачалі трапляць у паведамленні з фронту. Найбольш зацятыя баі разгарнуліся ў ваколіцах Снова. Штаб узброеных сіл ЛітБел паведамляў:

*«10 мая. На паўночны ўсход ад мястэчка Сноў перастрэлкі разведчыкаў»* [22, с. 3].

*«11 мая. Праціўнік паспрабаваў падыйсці да вёскі Каменка і Жылічы, але сустрэчнай контратакай нашага геройскага Н-скага кавалерыйскага дывізіёна быў адбіты»* [23, с. 4].

*«24 мая. Каля вёскі Грыцкавічы, на поўдзень ад мястэчка Сноў, мы прымусілі пасля боя адступіць атрад праціўніка»* [26, с. 3].

*«27 мая. На Баранавіцкім напрамку ружэйная перастрэлка і пошукі разведчыкаў. У раёне м. Сноў сутычкі разведвальных аддзелаў»* [27, с. 3].

*«2 чэрвеня. Каля в. Студзёнкі – на захад ад Замір'я – праціўнік адкрыў ружэйны і кулямётны агонь па нашай заставе. Перастрэлка працягваецца: ружэйны і кулямётны*

*агонь з абодвух бакоў. Пры падтрымцы артылерыі і кулямётаў праціўнік павёў наступленне на фальварак Завушша, на паўночны ўсход ад м. Сноў, але контрнаступленнем роты Н-скага палка адагнаны за в. Панюцічы»* [28, с. 3].

У чэрвені 1919 г. на фронце каля Нясвіжа наступіла адноснае зацішша. Прынамсі ў франтавых паведамленнях назвы горада і ваколіцаў сустракаюцца не так часта, як раней. Можна знайсці згадкі пра перастрэлку з коннымі легіянерамі каля Лысіцы, пра артылерыйскі абстрэл у раёне вёскі Казлы, пра тое, што чырвонымі аддзеламі занята вёска Гусакі [30, с. 2; 31, с. 2]. Гэты перыяд выкарысталі для актывізацыі савецкай і партыйнай работы. Яшчэ пасля сакавіцкіх хваляванняў некаторыя кіраўнікі былі адхілены ад сваіх пасад за парушэнне законнасці. Цяпер жа пачалася чарговая хваля «чыстак», якая называлася «рэканструкцыяй і папаўненнем рэўкама». Некаторых камуністаў выключылі з партыі, а былога ваеннага камісара Шаліка, нават аддалі пад суд. 9 чэрвеня 1919 г. быў зацверджаны новы Нясвіжскі рэвалюцыйны камітэт, сфарміраваны «таварышам Разэнталем» [2, с. 125]. Гэтым жа перыядам датуюцца звесткі пра перайменаванне нясвіжскіх вуліц. У прыватнасці, Рыначная плошча на кароткі час атрымала імя Маісея Урыцкага [38, с. 2] – першага старшыні Петраградскай Надзвычайнай Камісіі, які загінуў у 1918 г.

Кожную нядзелю і ў базарныя дні, калі ў горадзе збіралася шмат сялян, на плошчы арганізоўваліся мітынгі, прысвечаныя розным пытанням. 29 мая быў праведзены мітынг на тэму «Ці можа быць паспяховай сацыяльная рэвалюцыя», 1 чэрвеня – «Савецкая ўлада і царква». Каб прыцягнуць увагу аудыторыі, прамоўцы выступалі на польскай, рускай і беларускай мовах [30, с. 3]. Не сталі выключэннем і невялікія вёскі. Так, у Пахабаўшчыне адбыўся мітынг з удзелам сялян і чырвонаармейцаў «*11 батарэі Н-скага лёгкага артылерыйскага дывізіёна і Н-скага Варшаўскага гусарскага палка»*, на якім была прынята рэзалюцыя з заклікам «*усімі сіламі дапамагаць*

*Чырвонай Арміі... каб даць рашучы адпор белагвардзейскім бандам сусветных драпежнікаў»* [1, с. 3]. У в. Лысіца, адбітай у палякаў у першай дэкадзе чэрвеня, сяляне не толькі накармілі чырвонаармейцаў, але і сабралі ім на дарогу яйкі, масла, хлеб. Чырвонаармейца, які загінуў пры вызваленні вёскі, жыхары папрасілі пахаваць, на мясцовых могілках, як «нашага абаронцу». Развітальная цырымонія ператварылася ў вялікі мітынг, падчас якога многія сяляне не хавалі слёз [29, с. 2].

Тым часам франтавыя паведамленні гучалі даволі аптымістычна:

*«9 ліпеня. Баранавіцкі напрамак. Кавалерыя праціўніка, якая рухалася ўздоўж чыгункі, у раёне Замір'я была абстраляна нашай артылерыяй, пасля чаго рассеялася»* [32, с. 2].

*«11 ліпеня. Нашы аддзелы зайшлі ў фланг праціўніка, што залёг у лашчыне на захад ад Жанкавічаў, прагналі яго за вёску Долкінды, што недалёка ад м. Сноў. Захоплены ў палон адзін легіянер»* [33, с. 2].

*«14, 15 ліпеня. На Навагрудскім і Баранавіцкім напрамках без перамен»* [34, с. 2].

*«16 ліпеня. У раёне вёскі Лысіца захоплены адзін палонны»* [35, с. 2].

У рэальнасці ў гэты самы час палякі наступалі на паўночным захадзе ад Мінска, а на поўдні ад Нясвіжа чырвоныя аддзелы былі вымушаны адступіць за р. Нача. Каб супакоіць насельніцтва, мясцовыя ўлады звыкла пайшлі шляхам арганізацыі чарговага мітынга, які павінен быў дэманстраваць адзінства пралетарыяту, прадстаўнікоў сацыялістычных партый і чырвонармейцаў. У панядзелак 21 ліпеня з 5 гадзін вечара на плошчу пачалі сцягвацца прадстаўнікі прафсаюзаў, навучальных устаноў, дзяржаўных органаў і вайсковых аддзелаў. Луналі чырвоныя сцягі, грымелі рэвалюцыйныя маршы і «Інтэрнацыянал». Аратары гаварылі пра сусветную рэвалюцыю. Цікава, што на гэты раз вырашылі абыйсціся без беларускай мовы, але побач з рускай і польскай часта гучала яўрэйская. У рэзалюцыі

выказвалася ўпэўненасць у хуткай перамозе сацыялізму і падзенні старога ладу [38, с. 2].

А праз два дні 24–25 ліпеня польскія легіёны ажыццявілі наступленне на Нясвіж [37, с. 2]. І хоць яно было адбіта, але аддзелы 8-й стралковай дывізіі ўжо з цяжкасцю стрымлівалі непрыяцеля на подступах да горада. У наступныя дні баі вызначаліся асаблівай інтэнсіўнасцю: чырвонаармейцы спрабавалі выбіць палякаў з занятых пазіцый. Тым не менш польскія аддзелы паволі прасоўваліся наперад. У раёне Гарадзеі імі былі ўведзены ў бой нават бронецягнікі, супраць якіх давялося задзейнічаць чырвоную артылерыю. Вызначальнае сутыкненне адбылося 6 жніўня каля вёскі Малева. Атрад чырвонаармейцаў, які прыкрываў дарогу на Нясвіж быў атакаваны батальёнам Мінскага пяхотнага палка Войска Польскага, які захапіў пазіцыі на правым беразе Ушы. Каб пазбегнуць акружэння савецкае камандаванне загадала адводзіць войскі. У той самы дзень легіянеры ўвайшлі ў Нясвіж. 8 жніўня палякі захапілі Мінск, а да канца месяца імі была занята ўся тэрыторыя Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі [39, с. 75].

У 1920 г. будзе новае наступленне Чырвонай Арміі, другое абвяшчэнне БССР, контрнаступленне палякаў. У 1921 г. мірны дагавор падзеліць Беларусь на дзве палавіны. Нясвіжчына апынецца ў складзе Польскай дзяржавы, і толькі ў 1939 г. зноў стане часткай БССР. Гісторыя часам ідзе вельмі няпростым і пакручастым шляхам.

## Крыніцы і літаратура

1. Бедняк. – 1919. – 8 июня. – № 203.
2. Гесь, А. Нясвіжчына ў 1917–1920 гг. / А. Гесь // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Нясвіжскага раёна; рэдкал.: Г. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – С. 118–140.
3. Казак, П. За справу народную / П. Казак // Чырвоны сцяг. – 1958. – 30 снежня. – № 155.

4. Звезда. – 1919. – 21 января. – № 353.
5. Звезда. – 1919. – 24 января. – № 355.
6. Звезда. – 1919. – 26 января. – № 357.
7. Звезда. – 1919. – 9 февраля. – № 369.
8. Звезда. – 1919. – 14 февраля. – № 373.
9. Звезда. – 1919. – 15 февраля. – № 374.
10. Звезда. – 1919. – 26 февраля. – № 383.
11. Звезда. – 1919. – 28 февраля. – № 385.
12. Звезда. – 1919. – 2 марта. – № 387.
13. Звезда. – 1919. – 4 марта. – № 388.
14. Звезда. – 1919. – 8 марта. – № 392.
15. Звезда. – 1919. – 15 марта. – № 397.
16. Звезда. – 1919. – 21 марта. – № 401.
17. Звезда. – 1919. – 22 марта. – № 402.
18. Звезда. – 1919. – 23 марта. – № 403.
19. Звезда. – 1919. – 25 марта. – № 404.
20. Звезда. – 1919. – 9 мая. – № 432.
21. Звезда. – 1919. – 10 мая. – № 433.
22. Звезда. – 1919. – 11 мая. – № 434.
23. Звезда. – 1919. – 12 мая. – № 435.
24. Звезда. – 1919. – 15 мая. – № 437.
25. Звезда. – 1919. – 17 мая. – № 439.
26. Звезда. – 1919. – 25 мая. – № 446.
27. Звезда. – 1919. – 29 мая. – № 449.
28. Звезда. – 1919. – 4 июня. – № 453.
29. Звезда. – 1919. – 13 июня. – № 460.
30. Звезда. – 1919. – 15 июня. – № 462.
31. Звезда. – 1919. – 2 июля. – № 476.
32. Звезда. – 1919. – 11 июля. – № 485.
33. Звезда. – 1919. – 12 июля. – № 486.
34. Звезда. – 1919. – 16 июля. – № 489.
35. Звезда. – 1919. – 18 июля. – № 491.
36. Звезда. – 1919. – 19 июля. – № 492.
37. Звезда. – 1919. – 26 июля. – № 498.
38. Звезда. – 1919. – 31 июля. – № 503.
39. Ігнаценка, І. Інтэрвенцыя Польшчы / І. Ігнаценка // Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. – Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. – С. 70–76.

40. Ігнаценка, І. Утварэнне БССР / І. Ігнаценка, С. Хоміч // Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. – Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. – С. 105–112.
41. Пракапчук, А. З перажытага. Успаміны / А. Пракапчук // Полымя. – 1968. – № 11. – С. 161–176.
42. Хроника важнейших событий истории коммунистической партии Белоруссии: в 3 т. / Институт истории партии. – Минск : Госиздат БССР, 1970. – Т. 2 (1919 – июнь 1941). – 472 с.
43. Kozaczka, M. Ordynacja Nieświeska w latach 1914–1924 / M. Kozaczka // Kwartalnik Historyczny. – 1995. – T. 102. – Zesz. 2. – S. 27–42.
44. Powstanie Nieświeskie w 1919 roku – trzy relacje // Nieświeskie Wspomnienia. – Warszawa, 1999. – S. 139–144.
45. Ze wspomnień Nieświeskich // Życie Nowogródzkie. – 1928. – 11 listopada. – № 277.